**КРЫВАЯ НІВА** – вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 19 км на Захад ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 173 км ад Магілёва. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Краснаполле – Хоцімск. 1 гаспадарка, 2 жыхары (2007).

Вёска вядома з 1604 г. як сяло Крычаўскай "дзяржавы", уласнасць казны. У 1663 г. у валоданні памешчыка Цімафея Падабеда, які ў 1762 г. быў забіты казакамі са Старадуба і Мгліна, а сяло і маёнтак разрабаваны. Паводле інвентару Крычаўскага староства 1694 г. сяло, 4 дымы, 1,5 валокі зямлі. У 1747 г. – 11 двароў. У 1779 г. – 49 двароў, у складзе маёнтка графа Р.А. Пацёмкіна. У 1785 г. – 63 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце. У 1799 г. 6 двароў, 52 жыхары, 8 значыліся ва ўцёках. Па рэвізскіх матэрыялах 1816 г. уладанне памешчыкаў І.А. Міткевіча і Д. М. Хойніцкага. Па рэвізіі 1833 г. вёска, 62 сялянскія душы. У 1858 г. – 59 жыхароў мужчынскага полу, заезны двор. Памешчык меў тут у 1873 г. 160 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, карчму. Вёска адносілася да Брацькавіцкага праваслаўнага прыхода Пакроўскай царквы. Паводле перапісу 1897 г. – 27 двароў, 205 жыхароў, кузня, у Брацькавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Побач былі аколіца (75 двароў, 365 жыхароў) і фальварак (1 двор, 8 жыхароў, вадзяны і ветраны млыны). Апрача земляробства частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам.

У 1909 г. у вёсцы – 37 двароў, 306 жыхароў, у аколіцы – 80 двароў, 558 жыхароў, у фальварку – 1двор, 3 жыхары. У 1912 г. адкрыта земская школа, якая размяшчалася ў наёмнай сялянскай хаце. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені (4-х гадовая школа), у якой у 1925 г. вучыліся 42 вучні, школа размяшчалася ў наёмным памяшканні. З 20.08.1924 г. вёска ў Ветухноўскім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Па перапісе 1926 г. – 104 двары, 530 жыхароў. У 1930 г. быў створаны калгас "Перамога". Працавалі кузня, 2 ветракі, валюначоска. З 08.12.1959 г. вёска ў Дзяражненскім сельскім савеце. Паводле перапісу 1959 г. –338, у 1970 г. – 297 жыхароў. У 1986 г. – 70 гаспадарак, 172 жыхары, у складзе калгаса "Кранштат". У 2002 г. – 3 гаспадаркі, 6 жыхароў. Забудавана драўлянымі сялянскімі хатамі.